# ГІСТОРЫЯ І БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА. ЯК МІНУЛАЕ ФАРМІРУЕ СУЧАСНАСЦЬ

**І. В. Грабянчук**

## НАСТРОІ НАСЕЛЬНІЦТВА ЯК АБ'ЕКТ УВАГІ НАЦЫСЦКАЙ АКУПАЦЫЙНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (паводле нямецкіх дакументаў)

Насельніцтва Беларусі з самага пачатку Вялікай Айчвннай вайны не ўяўляла сабе ўсіх жахаў акупацыі. Людзі былі ў стане прыгнечанасці і разгубленасці, паводзілі сябе насцярожана. Некаторыя спадзяваліся, што з дапамогай гітлераўцаў можна выратавацца ад сталінскіх рэпрэсій і пазбавіцца ад бальшавізму. У нешматлікай часткі насельніцтва нават з'явіліся ілюзіі адносна "вызваленчай ролі Германіі". Такія спадзяванні моцна пахіснуліся пасля ўвядзення жорсткага акупацыйнага рэжыму. Карныя акцыі, падзеі на фронце, партызанская прапаганда змяншалі колькасць тых, хто верыў яшчэ нацыстам.

Акупацыйныя ўлады былі зацікаўлены ў захаванні калгасаў як найбольш зручнага інструмента для збора падаткаў на карысць рэйха. Аднак у гэтай справе яны сутыкнуліся з унутранымі супярэчнасцямі. Па-першае, сялянства выказвала спадзяванні, што "новая ўлада" калгасы распусціць. Па-другое, захаваць ў недатыкальнасці калгасную маёмасць было няпроста. Так, палявая камендатура 184-Мінск скардзілася: "Выдадзеныя сялянам і прызначаным новым кіраўнікам буйных калгасаў пасведчанні аб захаванні і недатыкальнасці калгаснай маёмасці і дабра знішчаюцца салдатамі рэквізіцыйных каманд пад камандаваннем унтэр-афіцэраў і нават афіцэраў і жывёла сганяецца" (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 937. Арк. 16-17).

Акрамя грабежніцкіх памкненняў часцей вермахта дадавала галаўнога болю "новай уладзе" і ненадзейнасць калабаранцкіх структур. Гаворка ідзе пра дапаможную службу паліцыі парадку, якая дзейнічала пры ўсіх нямецкіх установах, а таксама "беларускіх органах самакіравання". Акупанты вымушаны былі яе пастаянна кантраляваць, прызнаючы, што калі такі кантроль адсутнічаў, "…то гэту службу без перабольшання можна назваць як арганізаваную рабаўнічую банду. У цяперашні час амаль штодня ажыццяўляюцца рабункі і гвалт служачымі гэтай службы парадку" (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 931. Арк. 88).

Такія абставіны прымушалі акупантаў выдаткоўваць дадатковыя сродкі на сваю прапаганду. Напрыклад, 20 верасня 1941 г. у Мінску адбылася нарада кіраўнікоў груп актыўнай прапаганды прапагандысцкай роты "Остланд" з афіцэрам разведкі 707-й ахоўнай дывізіі і кіраўніком палітычнага аддзела генеральнага камісара для правядзення прапагандысцкай акцыі "Ахова ўраджая". На гэтай нарадзе высветлілася, што 707-я ахоўная дывізія не ў стане распаўсюдзіць тую друкаваную прадукцыю, якую прапагандысцкая

група “Остланд” ёй накіравала – 500 000 улётак, 10 000 ілюстраваных плакатаў і 10 000 вялікіх тэкставых плакатаў. У выніку знайшлі кампраміснае рашэнне: узгаданая дывізія прадставіць неабходную колькасць паліва, а ўстанова генеральнага камісара цалкам возьме на сябе распаўсюджанне той прапагандысцкай прадукцыі, для чаго выкарыстае транспартную службу горада Мінска. У дадатак да ўжо адпраўленых матэрыялаў здалі ў друк 15 000 ілюстравана-тэкставых плакатаў і 15 000 вялікіх тэкставых плакатаў (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 932. Арк. 108).

У зводцы з акупаваных тэрыторый ад 4 верасня 1941 г., якая была накіравана ў Берлін, падкрэслівалася, што тэрмінова неабходна актывізаваць нямецкую прапаганду, таму што нязначнасць пытанняў, якія яна закранае “…ні ў якім разе не не задавальняе і не ўспрымаецца насельніцтвам у сувязі з густамі насельніцтва, якое прывыкла да метадаў савецкай прапаганды, што праводзілася да вайны” (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 943. Арк. 164).

У рэалізацыі прапагандысцкіх праектаў акупантаў узнікла адна цікавая эканамічная калізія. Нямецкія франтавыя газеты з беларускімі старонкамі ў параўнанні з нямецкімі тарыфамі каштавалі 10 пфенінгаў за асобнік, што азначала ў пераводзе на савецкія грошы 1 рубель. Далей у дакуменце ідзе параўнанне, якое паказвае на моцнае зніжэнне прапагандысцкага патэнцыялу акупацыйнай прэсы з эканамічнага пункту гледзішча: “У савецкі час газета каштавала ўсяго 20 кап., так што ў вачах грамадзянскага насельніцтва нават вартасць газеты шматкроць узрасла. Нават “Мінская газета”, якая выходзіць на адной старонцы, каштуе 5 пфенінгаў, беларуская “Віцебская газета” каштуе 4 пфенінгі, нягледзячы на яе малы тыраж, але ва ўсіх выпадках кошт устаноўлены ў 2 разы вышэй папярэдняга савецкага кошту газеты” (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 943. Арк. 164).

Аднак самі па сабе прагандысцкія і адміністрацыйныя захады не маглі даць таго эканамічнага эфекту, на які разлічвала нацыская акупацыйная адміністрацыя. У сваю чаргу, ад гэтага залежалі і настроі паняволенага насельніцтва. Найбольш дальнабачныя нацысцкія чыноўнікі разумелі, што сутнасць праблемы палягае значна глыбей: “Усё больш становіцца зразумелым, што ўборка ўраджая, а тым самым і звязанае з ёй далейшае харчовае забеспячэнне, могуць быць забяспечаны толькі пры наяўнасці актыўнага добраахвотнага супрацоўніцтва сялянства. Але да тых пор, пакуль сяляне застаюцца ў няведанні адносна будучыні калгасаў і аплаты за прадукцыю, якія яны здаюць, то цалкам зразумела яны не будуць прыкладаць вялікіх высілкаў і зацікаўленасці ва ўборцы ўраджаю. А таму кіруючыя нямецкія ўстановы павінны даць сялянам запэўненне аб будучай форме сельскагаспадарчай вытворчасці” (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 938. Арк. 90-91).

Пэўныя надзеі на вырашэнне гэтай праблемы звязваліся з правядзеннем аграрнай рэформы. З вясны 1942 г. па лета 1943 г. дэкляраваліся тры пераходныя формы землекарыстання: абшчынная гаспадарка (замест калгасаў), земляробчыя таварыствы (кааператывы) і індывідуальныя сялянскія гаспадаркі. У траўні 1942 г. настроі ў акупацыйнай адміністрацыі былі даволі

аптымістычнымі: "Становішча на фронце, надзеі на лета і на паляпшэнне харчовагаа становішча, якое абяцае і гарадскому насельніцтву аграрная рэформа, значна садзейнічалі ўздыму настрою насельніцтва. Насельніцтва праяўляе гатоўнасць да супрацоўніцтва і ў думках большай часткай на баку немцаў. Харчовыя цяжкасці па-ранейшаму тыя ж. Калі ўдасца хаця б павольна палепшыць харчовае становішча, то можна разлічваць, што тады наступіць значнае паляпшэнне настрою насельніцтва і яго актыўнасць на нашу карысць" (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 936. Арк. 84-85).

У той жа час акупанты выразна разумелі хістскасць свайго становішча і тое, што рабаўнічы характар іх палітыкі будзе станавіцца ўсім усё больш відавочным, таму яны адчайна стараліся пашырыць маштабы сваёй прапаганды: "…З 15.5 гаспадарчай інспекцыяй будзе выдавацца руская рабочая газета. Газета будзе выходзіць адзін раз у тыдзень і распаўсюджвацца на ўсіх прадпрыемствах тэрыторыі тыла групы армій "Цэнтр". Найлепшай прапагандай у цяперашні час з'яўляецца добрае абыходжанне і харчовае забеспячэнне насельніцтва. Лісты, якія атрымліваюць сваякі ад вывезеных на работы ў Германію, у хуткім часе зробяць уплыў на настроі насельніцтва і не на нашу карысць" (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 936. Арк. 87). Дадзеная цытата выразна паказвае, што акупанты дастаткова добра разумелі чаго вартыя іх прапагандысцкія і агітацыйныя высілкі, накіраваныя на вярбоўку астарбайтараў.

Аналізуючы змест нямецкіх дакументаў, нельга не звярнуць увагу на тое, што ў іх часам гучаць саманадзейныя і самаўпэўненыя тэзісы, якія пераацэньваюць ступень уплыву палітыкі і прапаганды акупантаў на светапоглядныя пазіцыі паняволенага народа Беларусі: "У вольных ад партызан раёнах настроі насельніцтва добрыя. Партызанскі тэрор і бандыцкая дзейнасць у першую чаргу закранае вясковае насельніцтва. Вясковае насельніцтва, хоць яно амаль цалкам у сваіх думках на нашым баку, дзякуючы дзеянням партызан і іх распаўсюджвальнікам чутак паступова пачынае вагацца і ад гэта наносіць шкоду іх удзелу ў аднаўленчай працы. Правядзенне аграрнай рэформы адбілася станоўча. Запланаваную ў перспектыве раздачу маёнткаў асобным сялянам, якія добра зарэкамендавалі сябе ў барацьбе супраць партызан, ужо сёння можна разглядаць як паспяховую меру" (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 936. Арк. 105). Атрымліваецца, што дастаткова вырашыць праблему забеспячэння харчаваннем гарадскога насельніцтва, раздаць пабольш зямлі сваім памагатым-калабарантам – і наступіць такое жаданае "ўціхамірванне краіны"…

У паведамленнях аб дзейнасці і становішчы айнзатцгруп звычайна прысутнічаў пункт "паводзіны ў адносінах да немцаў". У іх прызнавалася, што гаспадарчыя ўмовы, у якіх жыве акупаванае насельніцтва, вельмі дрэнныя. Таму яму толькі і заставалася пры любым выпадку дэманстраваць свой давер да германскага кіраўніцтва, каб хоць крыху палепшыць сваё становішча. Пры гэтым большасць насельніцтва абыякава успрыняла перадачу кіраўнічых функцый генеральнаму камісарыяту Беларусі. Але ж у

асяроддзі інтэлігенцыі, заўважаюць акупанты, "…факт перадачы выклікаў пэўнае расчараванне, якое можна растлумачыць тым, што яны ў сённяшнім нямецкім цывільным кіраванні павінны прызнаваць працяглую ўладу і адмовіцца ад уласнай дзяржаўнасці і тым больш, што ім не ўдалося ажыццявіць у пажаданых памерах запланаванае ажыўленне беларускага нацыянальнага жыцця" (НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 945. Арк. 63).

Такім чынам, тэрор і прапаганда з'яўляліся асноўнымі інструментамі ўздзеяння на настроі насельніцтва ў акупаванай Беларусі. Нацысцкія ўлады вельмі выразна разумелі свае інтарэсы і ў сваёй палітыцы цынічна эксплуатавалі базавыя патрэбы людзей, якія апынуліся ў акупацыі і былі пастаўлены на мяжу элементарнага выжывання. У такіх умовах спадзяванні на магчымае усталяванне нейкіх інстытутаў беларускай дзяржаўнасці былі абсалютна марнымі.